## *П р а д м о в а*

Краязнаўчы каляндар на 2026 год падрыхтаваны на аснове “Спісаў знакамітых людзей Карэліцкага раёна”, даных архіва Карэліцкага ЗАГСа, краязнаўчай картатэкі Карэліцкай раённай бібліятэкі, фонда Карэліцкага раённага краязнаўчага музея і іншых крыніц.

Адбор юбілейных дат рабіўся ў адпаведнасці са значнасцю для гісторыі, эканомікі і культуры краю.

Дадзенае выданне дапаможа супрацоўнікам бібліятэк і клубаў раёна, музеям у арганізацыі работы, а таксама будзе карысна краязнаўцам і шырокаму колу чытачоў.

## *У 2026 годзе спаўняецца:*

**320 гадоў** таму (1706) у час Паўночнай вайны 1700-1721 гг. шведы спалілі Карэлічы, узарвалі замак у Навагрудку.

**65 гадоў** з дня нараджэння кандыдата медыцынскіх навук **Ігнатовіч Іны Генадзьеўны** (1961, г.п. Мір Карэліцкага раёна).

**85 гадоў** з дня нараджэння кандыдата медыцынскіх навук **Кісцяня Мікалая Аляксандравіча** (1941, в. Тарасавічы Карэліцкага раёна).

**95 гадоў** з дня нараджэння кандыдата тэхнічных навук **Конюха Аляксандра Іосіфавіча** (1931, в. Турэц Карэліцкага раёна).



**120 гадоў** з дня нараджэння пісьменніцы **Рытар Іны** (Саковіч Аляксандры) (1906, ур. г. Адэсы, бацькі – ур. в. Ярэмічы Карэліцкага раёна – 1997).



**140 гадоў** з дня нараджэння яўрэйскага паэта, драматурга і публіцыста **Давіда Эйнхорна** (1886, г.п. Карэлічы – 1973).



**120 гадоў** з дня нараджэння **Ясюка Эмануіла**, беларускага грамадска-палітычнага дзеяча (1906, в. Жухавічы Карэліцкага раёна – 1977).

**65 гадоў** назад (1961) было створана Карэліцкае раённае аддзяленне “Сельгастэхніка” Гродзенскага абласнога аб’яднання “Сельгастэхніка”, з 2001 г. – Адкрытае акцыянернае таварыства “Карэліцкая сельгастэхніка ”.

***Студзень***

**60 гадоў** (1966) камунальнаму сельскагаспадарчаму вытворчаму ўнітарнаму прадпрыемству “Птушкафабрыка “Чырвонаармейская”.



01.01. – **85 гадоў** з дня нараджэння беларускага вучонага ў галіне эксперыментальнай батанікі, акадэміка НАН Беларусі, доктара біялагічных навук, прафесара **Ламана Мікалая Афанасьевіча** (1941, в. Загор’е Карэліцкага раёна).



01.01. – **85 гадоў** з дня нараджэння **Крэмко Віталя Ільіча**, спецыяліста ў галіне

сельскагаспадарчай вытворчасці, заслужанага работніка сельскай гаспадаркі Беларусі (1996). У 1984-2009 гг. – старшыня СВК “Кастрычнік-Гродна” Гродзенскага раёна (1941, в. Беражна Карэліцкага раёна – 2009).



02.01. – **70 гадоў** з дня нараджэння беларускага літаратуразнаўца, культуролага, педагога, кандыдата філалагічных навук **Кароткага Уладзіміра Георгіевіча** (1956, г.п. Мір Карэліцкага раёна).



04.01. – **95 гадоў** з дня нараджэння кандыдата філалагічных навук, беларускага мовазнаўца, празаіка, публіцыста **Крамко Івана Ігнатавіча** (1931, в. Беражна Карэліцкага раёна – 2019).



08.01. – **95 гадоў** з дня нараджэння паэта **Вярбіцкага Івана Іванавіча** (1931, ур. в. Куравічы Навагрудскага р-на, жыў у г.п. Карэлічы – 2018).

17.01. – **85 гадоў** з дня нараджэння доктара тэхнічных навук, прафесара, беларускага вучонага ў галіне цеплаэнергетыкі **Качана Аркадзя Дзмітрыевіча** (1941, в. Вірышча Карэліцкага раёна – 2004).

## *Люты*

09.02. – **70 гадоў** з дня нараджэння кандыдата сельскагаспадарчых навук **Паўловіча Сяргея Іванавіча** (1956, в. Далматаўшчына Карэліцкага раёна).



11.02. – **65 гадоў** з дня нараджэння беларускага дзяржаўнага дзеяча **Палуяна Уладзіміра Мікалаевіча**. У 2009-2014 гг. – міністр па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь (1961, в. Некрашэвічы Карэліцкага раёна).

14.02. – **95 гадоў** з дня нараджэння кандыдата філалагічных навук **Булдыка Івана Мітрафанавіча** (1931, в. Церабостынь Карэліцкага раёна).

18.02. – **95 гадоў** з дня нараджэння беларускага вучонага ў галіне ветэрынарыі, ветсанэкспертызы, доктара ветэрынарных навук, прафесара **Богуша Аляксандра Аляксандравіча** (1931, г.п. Карэлічы – 2022).

26.02. (11.03.) – **115 гадоў** з дня нараджэння беларускага святара, літаратара, даследчыка беларускай культуры, гісторыі рэлігіі і царквы на Беларусі, асветніка,

вучонага, рэлігійнага і грамадскага дзеяча **Гарошкі Льва Юр'евіча** (1911, в. Трашчычы Карэліцкага раёна – 1977).

### *Сакавік*

04.03. – **85 гадоў** з дня нараджэння беларускага вучонага-эканаміста, прафесара **Мірачыцкай Ірыны Уладзіміраўны** (1941, в. Скорычы Карэліцкага раёна).

07.03. – **85 гадоў** з дня нараджэння кандыдата медыцынскіх навук **Пяшко Аляксандра Фёдаравіча** (1941, в. М.Вобрына Карэліцкага раёна).



08.03.– **125 гадоў** з дня нараджэння беларускага выдаўца і рэдактара , актывіста КПЗБ **Карповіча Аляксандра Вікенцьевіча** (1901, в. Трашчычы Карэліцкага раёна – 1986).

### *Красавік*



01.04. – **80 гадоў** з дня нараджэння беларускага матэматыка, педагога, доктара педагагічных навук, прафесара **Булдыка Георгія Мітрафанавіча** (1946, в. Церабостынь Карэліцкага раёна).



04.04. – **90 гадоў** з дня нараджэння беларускага паэта, рэдактара, сцэнарыста **Тармолы (Тармолы-Мірскага) Рамана Якубавіча** (1936, г.п. Мір Карэліцкага раёна – 2011).

28.04. – **115 гадоў** з дня нараджэння актывіста КПЗБ, настаўніка **Каляды Васіля Рыгоравіча.** У 1959-1969 гг. – дырэктар дома-музея Адама Міцкевіча ў Навагрудку (1911, в. Кальчычы Карэліцкага раёна – ?).

29.04. – **70 гадоў** з дня нараджэння беларускага мовазнаўца, педагога, кандыдата філалагічных навук, дацэнта **Зялёнка Вольгі Георгіеўны** (1956, г.п. Мір Карэліцкага раёна).



30.04. – **145 гадоў** з дня нараджэння **Журбы Янкі** (сапр. **Івашын Іван Якаўлевіч**; 1881-1964), беларускага паэта, перакладчыка, настаўніка. У 1914 г. працаваў настаўнікам у Карэлічах.

***Май***

02.05. – **75 гадоў** з дня нараджэння беларускага педагога-метадыста, матэматыка, кандыдата педагагічных

навук, дацэнта **Солтана Генадзя Мікалаевіча** (1951, в. Мядзвядка Карэліцкага раёна).



05.05. – **70 гадоў** з дня нараджэння беларускага кінаакцёра, заслужанага артыста Беларусі, уладальніка знака Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь “За значны асабісты ўклад у развіццё культуры Беларусі” **Цярпінскага Анатоля Канстанцінавіча** (1956, в. Мінакі Карэліцкага раёна).



10.05. – **85 гадоў** з дня нараджэння кандыдата медыцынскіх навук (1973), дацэнта, анестэзіёлага-рэаніматолага **Варанко Алены Андрэеўны** (1941, в. Малюшычы Карэліцкага раёна).



14.05. – **70 гадоў** з дня нараджэння кандыдата сацыялагічных навук, дацэнта **Богуш Таццяны Аляксандраўны**. З 1982 г. працуе ў ГрДУ імя Я. Купалы, (1956, г.п. Мір Карэліцкага раёна).



25.05. – **90 гадоў** з дня нараджэння беларускага пісьменніка, ваеннага журналіста **Смалянкі Анатоля**

**Уладзіміравіча** (1936, в. Рудзьма Карэліцкага раёна – 2014).

### ***Чэрвень***

**85 гадоў** таму (26.06.1941) Карэліцкі раён акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі. З 08.07.1944 г. тэрыторыя раёна вызвалена ад акупацыі.



15.06. **– 195 гадоў** з дня нараджэння **Вінцэнта (Вінцэся) Каратынскага**, беларускага і польскага пісьменніка, паэта, публіцыста, перакладчыка (1831, в. Селішча Карэліцкага раёна – 1891).

15.06. – **70 гадоў** з дня нараджэння беларускага архітэктара, дзяржаўнага дзеяча, навуковага кіраўніка і аўтара праекта рэстаўрацыі Мірскага замка **Бубноўскага Дзмітрыя Сямёнавіча** (1956, г.п. Мір Карэліцкага раёна).



19.06. – **115 гадоў** з дня нараджэння сына Янкі Маўра, савецкага і беларускага фізіка-тэарэтыка, акадэміка АН БССР (1966), доктара фізіка-матэматычных навук (1955), прафесара (1957), заслужанага дзеяча навукі БССР (1968), лаурэата

Дзяржаўнай прэміі БССР і СССР, Героя Сацыялістычнай Працы (1978) **Фёдарава Фёдара Іванавіча** (1911, в. Турэц Карэліцкага раёна – 1994). Адзін з заснавальнікаў школы тэарэтычнай фізікі Беларусі.

***Ліпень***

**85 гадоў** таму (1941) было створана Карэліцкае гета, куды фашысты сагналі 989 чалавек. У канцы 1942 года ўсе вязні гета былі вывезены ў Навагрудскае гета і знішчаны.

01.07. – **80 гадоў** з дня нараджэння кандыдата біялагічных навук **Араб'я Мікалая Міхайлавіча** (1946, ур. в. В. Вобрына Карэліцкага раёна).



01.07. – **140 гадоў** з дня нараджэння яўрэйскага пісьменніка, перакладчыка, драматурга **Іцхака Кацэнельсана** (1886, г.п. Карэлічы – 1944).



07.07. – **230 гадоў** з дня нараджэння беларуска-польскага паэта, драматурга, фальклярыста, этнографа **Чачота Яна Тадэвушавіча** (1796, в. Малюшычы Карэліцкага раёна – 1847).



14(26).07. – **130 гадоў** з дня нараджэння празаіка, беларускага пісьменніка, журналіста **Варавы Уладзіміра Аляксеевіча** (псеўданім Дзядок) (1896, в. Вялікія Жухавічы Карэліцкага раёна – 1929).

***Жнівень***

02.08. – **90 гадоў** з дня нараджэння кандыдата эканамічных навук **Шавейкі Мікалая Іванавіча** (1936, в. Церабостынь Карэліцкага раёна).



07.08. – **70 гадоў** з дня нараджэння беларускага дзяржаўнага дзеяча, інжынера – электрыка, кандыдата тэхнічных навук, педагога **Бусько Віталя Леанідавіча** (1956, в. Лядкі Карэліцкага раёна).



09.08. – **100 гадоў** з дня нараджэння беларускага грамадска-культурнага дзеяча, гісторыка, палітолага, паэта, публіцыста, доктара гістарычных навук **Запрудніка Янкі** (Вільчыцкага Сяргея Мікалаевіча) (1926, г.п. Мір Карэліцкага раёна – 2022).

10.08. – **90 гадоў** з дня нараджэння кандыдата эканамічных навук, дацэнта **Ульянкі Барыса Васільевіча** (1936, в. Антанёва Карэліцкага раёна).



18.08. – **90 гадоў** з дня нараджэння кандыдата філалагічных навук, беларускага мовазнаўцы, педагога **Гаўрош Ніны Васільеўны** (1936, в. Лукі Карэліцкага раёна).

***Верасень***



06.09. – **90 гадоў** з дня нараджэння беларускага вучонага ў галіне заатэхнікі і эканомікі сельскай гаспадаркі, дзяржаўнага дзеяча, былога першага міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі (1991-1994), члена-карэспандэнта Акадэміі аграрных навук Беларусі, заслужанага работнікі сельскай гаспадаркі Беларусі, лаўрэата прэміі Савета Міністраў СССР (1976), кавалера ордэна Леніна **Мірачыцкага Фёдара Уладзіміравіча** (1936, в. Баяры Карэліцкага раёна – 2020).



07.09. – **90 гадоў** з дня нараджэння кандыдата тэхнічных навук, дацэнта

**Каралько Аркадзя Антонавіча** (1936, в. Скрышава Карэліцкага раёна – 2017).

22.09. – **125 гадоў** з дня нараджэння **Пансевіча-Каляды Васіля Іванавіча** (1901, в. Пагор'е Карэліцкага раёна – 1986), беларускага вучонага ў галіне арганічнай хіміі, доктара хімічных навук (1966), прафесара (1967), заслужанага дзеяча навукі БССР (1968).

25.09. – **30 гадоў** з часу стварэння гідралагічнага заказніка рэспубліканскага значэння **«Міранка»** ў Карэліцкім раёне (1996).

### *Кастрычнік*



06.10. – **150 гадоў** з дня нараджэння **Яна Булгака**, беларускага і польскага майстра мастацкай фатаграфіі, фалькларыста, этнографа, краязнаўцы (1876, в. Асташын Карэліцкага раёна – 1950).



20.10. – **115 гадоў** з дня нараджэння беларускага мастака, графіка **Рамановіча Валянціна Сцяпанавіча** (1911, г.п. Карэлічы – 1945).



10.10. – **120 гадоў** з дня нараджэння дзеяча рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі, удзельніка партызанскага руху ў Вялікую Айчынную вайну, дзяржаўнага дзеяча, кавалера двух ордэнаў Леніна **Жалезняковіча Паўла Арсеньевіча**. У 1944-1968 гг. – старшыня Мірскага райвыканкама, Карэліцкага пасялковага Савета, першы сакратар Любчанскага, Карэліцкага РККПБ (1906, в. Лешня Капыльскага раёна Мінскай вобласці – 1971).



28.10. – **115 гадоў** з дня нараджэння савецкай актрысы тэатра і кіно, народнай артысткі РСФСР **Квяткоўскай Зінаіды Аляксандраўны** (1911, г.п. Мір Карэліцкага раёна – 1988).

***Лістапад***



03.11. – **80 гадоў** з дня нараджэння паэткі, кіраўніка літаратурнага аб'яднання "Рэчанька" пры раённай газеце "Полымя", выдатніка адукацыі Рэспублікі Беларусь **Калтуновай Галіны Паўлаўны** (1946, в. Падгайна Карэліцкага раёна).



07.11. – **125 гадоў** з дня нараджэння **Фаменкі Яўхіма Іванавіча** (1901 – 1983),

удзельніка партызанскага руху ў гады Вялікай Айчыннай вайны, Героя Сацыялістычнай Працы (1966). Пасля вайны жыў і працаваў у Карэліцкім раёне.

08.11. – **85 гадоў** з дня нараджэння беларускага гісторыка, археолага, доктара гістарычных навук **Гурына Міхаіла Фёдаравіча** (1941, в. Радунь Карэліцкага раёна – 2024).

11.11. – **125 гадоў** з дня нараджэння ваеннага дзеяча, генерала-маёра **Быліча Рыгора Іванавіча** (1901, в. Заполле Карэліцкага раёна – 1960).



16.11. – **115 гадоў** з дня нараджэння **Гавурына Марка Канстанцінавіча** (1911, г.п. Мір Карэліцкага раёна – 1992), савецкага матэматыка, доктара фізіка-матэматычных навук (1964).

19.11. – **135 гадоў** з дня нараджэння беларускага палітычнага дзеяча, журналіста, удзельніка рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі **Гурына-Маразоўскага Міхаіла Іванавіча** (1891, в. Ярэмічы Карэліцкага раёна – 1928).

23.11. – **115 гадоў** з дня нараджэння **Архіепіскапа Багалепа** (у свеце Анцух Міхаіл Раманавіч; 1911, в.

Скорычы Карэліцкага раёна – 1978), архіерэя Рускай праваслаўнай царквы.

28.11. – **100 гадоў** з дня нараджэння беларускага вучонага ў галіне інфарматыкі і тэхнічнай кібернетыкі, доктара тэхнічных навук, прафесара **Раковіча Аляксандра Гаўрылавіча** (1926, в. Лясок Карэліцкага раёна – 2000).



30.11. – **70 гадоў** з дня нараджэння беларускага артыста оперы (бас), заслужанага артыста Беларусі (2003) **Кеды Аляксандра Аляксандравіча** (1956, в. Турэц Карэліцкага раёна).

***Снежань***



14.12. – **85 гадоў** з дня нараджэння былога міністра ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь, генерала-лейтэнанта ўнутранай службы **Данько Уладзіміра Антонавіча** (1941, в. Сэрвач Карэліцкага раёна – 2018).

14.12. – **115 гадоў** з дня нараджэння беларускага грамадскага дзеяча, правазнаўца, публіцыста **Калодкі Аляксандра** (1911, в. Церабостынь Карэліцкага раёна – 1985).



16.12. – **125 гадоў** з дня нараджэння генерала-маёра **Калеснікава Уладзіміра Паўлавіча** (1901, в. Сіняўская Слабада Карэліцкага раёна – 1944).



18.12. – **125 гадоў** з дня нараджэння савецкага ваеннага дзеяча, генерала-палкоўніка артылерыі **Нагорнага Мікалая Нічыпаравіча** (1901, в. Асташын Карэліцкага раёна – 1985).

18.12. – **255 гадоў** з дня нараджэння вайсковага і палітычнага дзеяча, удзельніка паўстанняў 1794 г. і 1830-1831 гг. **Несялоўскага Францішка Ксаверыя** (1771 – 1843 ці 1845). Меў родавы маёнтак у в. Варонча Карэліцкага раёна.



25.12. – **80 гадоў** з дня нараджэння беларускага мовазнаўца, педагога, доктара філалагічных навук, прафесара **Станкевіч Аляксандры Аляксандраўны** (1946, в. Вялікія Тупалы Карэліцкага раёна).